Мінскае і Гомельскае вучылішчы, вучылішчы культуры і мастацтваў, музычныя вучылішчы скіраваны на развіццё мастацкіх здольнасцей навучэнцаў, стварэнне ўмоў для набыцця спецыяльных уменняў, навыкаў, майстэрства, ведаў у адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй у мастацтве.

Навучальныя планы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў у значнай ступені скіраваны на практычнае засваенне прафесій. Напрыклад, па спецыяльнасці "інструментальнае выканальніцтва" (духавыя інструменты) з агульнай колькасці 5003 гадзіны на спецыяльную (прафесійную) падрыхтоўку адведзена 4000 гадзін практычных заняткаў — пераважная большасць. З іх чвэрць (1050 гадзін) — на індывідуальныя заняткі. Па спецыяльнасці "дэкаратыўна-прыкладное мастацтва" з агульнай колькасці 4680 гадзін на спецыяльную (прафесійную) падрыхтоўку адведзена 3227 гадзін практычных заняткаў.

Такім чынам, прафесійнае навучанне ў мастацтве ажыццяўляецца праз практычную мастацкую дзейнасць вучня ў час урока і потым завяршаецца непасрэдна выхадам да публікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.М.Ушакова,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры,**
**Р.Ф.Шаура,**
**прафесар Беларускага універсітэта культуры**

## НА ШЛЯХУ ДА ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА

Палажэнне аб педагагічнай практыцы студэнтаў непедагагічных ВНУ, якое праходзіць апрабацыю ў вучэбным працэсе Беларускага універсітэта культуры, адлюстроўвае агульныя патрабаванні да яе арганізацыі і правядзення як аднаго з важных этапаў ажыццяўлення навучальнага працэсу ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста вышэйшай школы.

На аснове дадзенага палажэння распрацоўваюцца праграмы па кожнай спецыялізацыі, у якіх падкрэсліваюцца асаблівасці, характэрныя для профілю выкладаемых дысцыплін.

Педагагічная практыка праводзіцца ў адпаведнасці з тыпавымі вучэбнымі планамі ВНУ па спецыяльнасцях на базе вучэбна-выхаваўчых устаноў (агульнаадукацыйныя школы, сярэднія прафесійна-тэхнічныя, сярэднія спецыяльныя і пазашкольныя ўстановы, спецыялізаваныя школы і інш.), замацаваных за вышэйшай навучальнай установай тэрмінам на пяць гадоў.

Мэта педагагічнай практыкі — падрыхтоўка спецыяліста да самастойнай дзейнасці ў вучэбнай установе. У якасці асноўнай дамінанты выступае неабходнасць замацавання, паглыблення і развіцця тэарэтычных ведаў, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні псіхалагічных, педагагічных і спецыяльных дысцыплін. Асноўнымі прынцыпамі арганізацыі педагагічнай практыкі з'яўляюцца:

— пераемнасць са зместавымі і працэсуальнымі бакамі навучання ў ВНУ;

— адзінства і пераемнасць яе асабістых зместавых, метадычных і тэхналагічных аспектаў пры распрацоўцы і правядзенні вучнямі вучэбна-выхаваўчых мерапрыемстваў;

— сувязь і інтэрпрэтацыя тэарэтычных асноў педагогікі супрацоўніцтва з практыкай ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчай дзейнасці. У якасці метадалагічнай падрыхтоўкі педагогаў мэтазгодна выкарыстанне філасофскага палажэння аб узаемасувязі агульнага, спецыфічнага (тыповага) і канкрэтнага, што садзейнічае аб'ектыўнаму рашэнню комплекснай праблемы ўдасканальвання вышэйшай прафесійнай адукацыі ў новых умовах.

Вызначэнне тэарэтычных асноў распрацоўкі зместу практычнай падрыхтоўкі педагога ажыццяўляецца адносна тэорыі культуры ў філасофіі і тэорыі прафесійнай адукацыі ў педагогіцы, прапанаваных у работах Р.Бернса, Д.Біндзі, Боаса, М.Латыша, А.Ляўко, В.Ляднёва і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абгрунтаванне зместавых аспектаў ажыццяўляецца з апорай на тэорыю дзейнасці А.М.Лявонцьева, фарміраванне разумовых дзеянняў П.А.Гальперына, паэтапнага мадэліравання зместу вузаўскай адукацыі А.Ц.Растунова. В.А.Сласцёніна, Е.Э.Смірновай, Н.Ф.Талызінай, В.Я.Яхава, а таксама на канцэпцыю бесперапыннай адукацыі, прадстаўленую ў працах В.С.Абасавай, Н.А.Аітава, А.П.Уладзіслаўлева, А.П.Сманцара і інш.

Пры распрацоўцы алгарытму функцыяніравання педагагічнай практыкі студэнтаў у вышэйшай школе выкарыстоўваліся прадстаўленні аб складанасці і цэласнасці яе ў сістэме педагагічнай адукацыі, выказаныя ў працах В.А.Абдулінай, В.К.Бабанскага, Я.П.Бедкіна, В.П.Беспалка, Н.В.Кузьміной, В.С.Ляднёва, А.В.Пятроўскага, В.А.Сласцёніна і інш.

Накіраванасць педагагічнай практыкі студэнтаў носіць у асноўным псіхолага-педагагічны характар, у тым ліку прыймальна навукова-даследчая арыентацыя дзейнасці.

Для ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчага працэсу абавязковым з'яўляецца набыццё неабходных ведаў і ўменняў па адборы і структураванні зместу адукацыі. Будучы педагог павінен умець выконваць рэфлексію педагагічных уз-дзеянняў, карэкціраваць паводзіны навучэнцаў. У сувязі з гэтым асобную важнасць набывае фарміраванне ў студэнтаў патрэбы самастойнага ажыццяўлення дадзеных відаў дзейнасці. Гэта дасягаецца пры вывучэнні цыкла псіхолага-педагагічных дысцыплін і прымянення атрыманых ведаў, уменняў, навыкаў з улікам канкрэтнага сацыяльна-прафе-сійнага фону.

Самастойнае правядзенне заняткаў, лабараторных, практычных работ і іншае садзейнічае прыцягненню будучых педагогаў да ўдасканальвання, распрацоўкі і апрабацыі методык і сучасных тэхналогій навучання. Пры падрабязным разгдядзе асноўных педагагічных працэсаў і з'яў студэнты набываюць веды і навыкі ажыццяўлення сістэмнага падыходу. Прымяненне ведаў з элементамі творчай інтэрпрэтацыі адбыва-

ецца і ў працэсе правядзення пазавучэбнай дзейнасці. Іх творчае выкарыстанне садзейнічае фарміраванню прафесійнага педагагічнага майстэрства.

У працэсе выканання псіхолага-педагагічных заданняў спецыяльных кафедраў студэнты атрымоўваюць навыкі правядзення самастойных даследаванняў у галіне прафесійнай педагогікі. Аснову дадзенага вопыту складаюць практычныя ўменні ў праектаванні вынікаў наступнай дзейнасці. Логіку такой пабудовы можна лічыць універсальнай для любой прафесійнай галіны, а значыць, і нарматыўнай. Сутнасць нарматываў, якія рэгламентуюць дзейнасць педагога, вызначаецца зместам педагагічных функцый. Найбольш значнай з іх, з пункту гледжання новай парадыгмы адукацыі, з'яўляецца функцыя праектавання. Вынікам дзейнасці ў адпаведнасці з ёй могуць быць розныя нарматыўныя дакументы: прафесійна-кваліфікацыйная характарыстыка, вучэбныя планы і праграмы. Першы з іх вызначае ўзровень кваліфікацыі спецыяліста, аб'ём прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў. Кваліфікацыйную характарыстыку можна лічыць абагульненай мадэллю будучай дзейнасці спецыяліста і выкарыстоўваць яе ў прафарыентацыйных і вучэбна-метадычных цэнтрах (аб'яднаннях) па распрацоўцы педагагічных праектаў.

Праектаванне сістэмы педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў непедагагічных вузаў дапускае распрацоўку вучэбнага плана дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла, праграмы кваліфікацыйнага экзамена і палажэння або інструкцыі па правядзенні педагагічнай практыкі. Пералік і змест названых нарматыўных дакументаў абумоўлены патрэбай грамадства ў педагогах, ствараюць прадстаўленне аб іх і ўлічваюць магчымасці для іх фарміравання.

Тэарэтычнае забеспячэнне педагагічнай практыкі студэнтаў непедагагічных вузаў ажыццяўляецца пры дапамозе агульнай педагогікі і псіхалогіі, псіхалогіі творчасці і методыкі выкладання спецыяльных прадметаў. Вучэбны план падрых-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тоўкі спецыялістаў з дадатковай кваліфікацыяй педагога адюстроўвае аб'ём вучэбнага часу, тэрміны і месца правядзення практыкі.

Тэарэтыка-метадычныя дысцыпліны павінны забяспечыць папераджальны характар навучання, аднак спецыфіку ўзаемасувязі тэарэтычнага і практычнага кампанентаў мэтазгодна вызначыць канкрэтна па кожнай спецыялізацыі. Трэба ўлічваць сацыяльна-прафесійны фон, ва ўмовах якога вучэбныя прадметы аказваюцца запатрабаванымі.

Пры падвядзенні вынікаў выпускнога кваліфікацыйнага экзамену выяўляецца агульная карціна выпрацоўкі ў будучых педагогаў асноўных уменняў і навыкаў, здольнасцей да даследчай работы, засваення тэарэтычных ведаў па спецыяльных дысцыплінах, агульнай педагогіцы і псіхалогіі, методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін.

Вынікі тэарэтычнай і практычнай педагагічнай падрыхтоўкі мэтазгодна ўлічваць пры вызначэнні магчымасці выпускнікоў навучацца ў магістратуры і аспірантуры.

Папярэднія вынікі апрабацыі палажэння аб педагагічнай практыцы студэнтаў у Беларускім універсітэце культуры паказалі, што даступнасць вышэйшай педагагічнай адукацыі могуць забяспечваць любыя навучальныя ўстановы. Мэтазгоднасць такой падрыхтоўкі абумоўлена аб'ектыўнай патрэбай кожнай канкрэтнай прафесійнай дзейнасці ў педагагічных ведах, а таксама запатрабаванасцю педагагічных кадраў.

Што тычыцца спецыялістаў з мастацкай кваліфікацыяй у сферы педагагічнай дзейнасці, то патрэба ў іх сёння вельмі вялікая. Агульнаадукацыйныя і спецыяльныя школы, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы і вучылішчы з мастацкім ухілам не поўнасцю забяспечаны выкладчыкамі па дысцыплінах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Спецыялізаваныя факультэты педагагічных універсітэтаў, якія рыхтуюць адпаведныя кадры, не вырашаюць гэтую праблему на дад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зеным этапе. Таму спецыялізацыя “народныя рамёствы” Беларускага універсітэта культуры, акрамя асноўнай кваліфікацыі, узяла на сябе адказнасць рыхтаваць спецыялістаў з дадатковай кваліфікацыяй выкладчыка спецыяльных дысцыплін. Гэта патрабавала ад кафедры пера-гдедзець некаторыя пытанні нарматыўнай дакументацыі і ўвесці дадатковыя дысцыпліны псіхолага-педагагічнага блока, дзе асобная ўвага стала ўдзяляцца арганізацыі і правя-дзенню педагагічнай практыкі. Асноўнымі базамі для правядзення педагагічнай практыкі з’яўляюцца мастацкія і з мастацкім ухілам школы, а таксама сярэднія агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы і мастацка-творчыя вучэбна-выхаваўчыя структуры, накшталт дзіцячых творчых цэнтраў рэспублікі. Педагагічная практыка для фарміравання і станаўлення будучага педагога з’яўляецца вельмі важнай і адказнай дамінантай у навучальным працэсе. Менавіта ў час педагагічнай практыкі замацоўваюцца тэарэтычныя веды, атрыманыя студэнтамі ў час лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў па педагогіцы, псіхалогіі, методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін, выпрацоўваюцца ўменні і навыкі працы з класам, творчым калектывам, індывідуальна з вучнем, выхаванцам. Аднак даволі сціслага тэрміну праходжання педагагічнай практыкі на працягу толькі аднаго семестра, як мы лічым, недастаткова. Неабходны новыя падыходы ў вырашэнні праблемы забеспячэння арганізацыі і правядзення педагагічнай практыкі ў непедагагічных вузах з улікам сучасных патрабаванняў навучання і выхавання моладзі. Рэформа сённяшняй агульнаадукацыйнай школы і ўсяго адукацыйна-выхаваўчага працэсу ў Беларусі патрабуе пошуку аптымальных шляхоў удасканальвання падрыхтоўкі спецыялістаў з педагагічнай кваліфікацыяй. І значэнне педагагічнай практыкі ў гэтым працэсе адно з самых важных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ